# “О, БЕЛАРУСЬ, МАЯ ШЫПШЫНА!”



**У рамках праекта “На хвалі часу, у плыні жыцця” Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь сумесна з інфармацыйнымі партнёрамі – часопісамі “Маладосць” і “Бярозка” праводзіла конкурс “О, Беларусь, мая шыпшына!”, які быў прымеркаваны да 120-годдзя вядомага беларускага паэта, празаіка, мовазнаўца Уладзіміра Дубоўкі, якога лічаць геніем беларускай зямлі.**

Удзельнікі ўзорнага тэатра “Вясёлка” Палаца культуры г.Барань вырашылі прыняць удзел у гэтым творчым спаборніцтве. Да ўдзелу ў конкурсе далучыліся Злата Міхайленка, Мацьвей Казлоў, Іван Байкоў, Дар’я Ціханская і Уладзіслаў Салянік. Паэтычная спадчына Уладзіміра Дубоўкі вельмі зацікавіла юных артыстаў сваёй прыгажосцю і лірычнасцю. Поўнай нечаканасцю для ўдзельнікаў нашага тэатра стала колькасць атрыманых творчых прац – каля 880 відэа даслалі чытальнікі розных узростаў з усёй Беларусі, а таксама з-за мяжы. Такім чынам, конкурс набыў не толькі рэспубліканскі, але і міжнародны рэзананс. Вялікая колькасць удзельнікаў, высокі мастацкі ўзровень творчых прац – усё гэта не давала нам надзеі на перамогу. Творчыя працы ацэньвала запрошанае экспертнае журы: Ірына Багдановіч – беларуская паэтка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ, Аксана Данільчык – беларуская паэтка, кандыдат філалагічных навук, Алеся Сівохіна – рэжысёр, мастацкі кіраўнік народнага літаратурнага тэатра “Жывое слова”.

Мы разумелі, што вылучыць лепшых сярод такой колькасці таленавітых і артыстычных удзельнікаў даволі складана. У пачатку снежня былі падведзены вынікі конкурсу і яны абярнуліся для нас поўнай нечаканасцю. У катэгорыі 14–17 гадоў лепшай стала Дар’я Ціханская, за верш “Пяе дзяўчына над ракою” яна атрымала першае месца! Атрымаць перамогу сярод такой колькасці ўдзельнікаў – гэта сапраўды вялікае дасягненне! Акрамя таго, у намінацыі “сапраўдны артыст” пераможцам быў абвешчаны яшчэ адзін удзельнік нашага тэатра Іван Байкоў за верш “Партызанскі баян”. Удзельнікі, якія занялі прызавыя месцы, будуць узнагароджаны на фінальным мерапрыемстве конкурсу, якое прызначана на вясну ў Мінску, пры паляпшэнні эпідэміялагічнай сітуацыі. Поспехі выхаванцаў нашага театра – гэта заўсёды вялікая радасць!

Хочацца выказаць вялікую ўдзячнасць супрацоўнікам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі за ідэю арганізацыі выдатнага праекта, накіраванага на папулярызацыю беларускай паэзіі, а таксама ад усёй душы павіншаваць выканаўцаў з такім высокім творчым поспехам, пажадаць новых перамог і дасягненняў!

*Людміла Сасніцкая,*

**на фота:Дар’я Ціханская**